ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
_________ І.Г.Лашкевіч
_________ 2021 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)”

Дата правядзення: _____________ 2021 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 11.40. (45 мінут, 10 мінут перапынак, 45 мінут).

**IVклас**

1. Прачытай тэкст

Зіма. Канец снежня. Хораша і прыгожа ў лесе. Мяккі пушысты снег паўсюль. На балотных купінах ускрай дарогі, на шэрым хмызняку, на зялёных шатах елак. Паветра лёгкае, чыстае.

*Паводле Я.Галубовіча*

2. Якая часціна мовы адсутнічае ў тэксце? Выберы адказ.

☐ назоўнік ☐ дзеяслоў
☐ прыметнік ☐ прыназоўнік

3. Прывядзі два доказы таго, што выпісаныя з тэксту выразы – гэта сказы.

Зіма. Канец снежня.

Доказ 1:_______________________________________________
Доказ 2:_______________________________________________

4. Настаўнік прапанаваў вучням падлічыць, колькі прыметнікаў ужыў аўтар у тэксце. Прачытай гутарку двух хлопчыкаў. З кім ты згодны? Адзнач свой выбар. Пацвердзі яго, выпісаўшы з тэксту ўсе прыметнікі.

☐ **Пеця:** У тэксце аўтар ужыў 9 прыметнікаў.

☐ **Ваня:** Няпраўда! У тэксце ўжыта 7 прыметнікаў.

Пацвярджэнне:_______________________________________________
_______________________________________________

5. Падбяры процілеглыя па сэнсе прыметнікі. Запішы.
Мяккі – ______________, лёгкае – _____________, чыстае – _____________.

6. Выпішы з тэксту словы, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае.

______________________________________________________________________

7. Знайдзі ў тэксце 5-ты сказ, вызнач у ім склон назоўнікаў.

8. Выпішы з тэксту да кожнай схемы па аднаму слову.



______________________________________________________________________

9. Прачытай верш.

Чуў, як часам гром грыміць?
Дол дрыжыць!
Лісцё трымціць!
Можа, думаеш, злуецца
дзядзька Гром?
Да не – смяецца!
гром смяецца,
гром рагоча –
неба бліскае,
грукоча.
(М. Чарняўскі)

А) Які загаловак будзе ўказваць на тэму тэксту? Адзнач адказ з прапанаваных варыянтаў або прапануй свой. Абгрунтуй выбар.

☐ Перад навальніцай. ☐ Грозны дзядзька Гром.
☐ Чаканне дажджу. ☐ Свой варыянт:_______________

Абгрунтаванне:___________________________________________________

______________________________________________________________________

Б) Якую часціну мовы выкарыстаў аўтар, каб паказаць гром як жывую істоту?

______________________________________________________________________

В) Уяві, што табе неабходна дадзеныя радкі верша выкарыстаць як пачатак свайго сачынення. Запішы кароткі план, пра што і ў якім парадку ты напішаш у сачыненні.

План
1. ____________________________________________
2. ____________________________________________
3. ____________________________________________

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
__________ І.Г.Лашкевіч
«23» сакавіка 2021 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”

Дата правядзення: 1 красакавіка 2021г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 12.00.

## V клас

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Укажыце, хто такі Ярыла паводле міфалогіі беларусаў? ______________________________
2. Як адным словам па-беларуску назваць *напиток из берёзового сока?* ______________________________
3. Паходжанне многіх фразеалагізмаў хаваецца ў далёкай старажытнасці і тлумачыцца светаўспрыманнем нашых продкаў. Якую жывёлу, па меркаванні нашых продкаў, трэба было з’есці, каб набыць вялікі вопыт, дасведчанасць, стаць спрактыкаваным? ______________________________
4. Закончыце выказванне. Арфаэпія – гэта ______________________________
5. Падкрэсліце арфаграмы ў слове *камп’ютар.*

**Заданне 2. Адкажыце на пытанні. Адказы пазначце ў табліцы (Пры адказе “так” пастыўце знак “+”, пры адказе “не” – пастаўце “–”).**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| № п/п | Пытанне | Адказ |
|---|---|---|
| 1. | У беларускай мове гук [д] пры змякчэнні змяняецца на [дз’] | |
| 2. | У беларускай мове гук [т] пры змякчэнні змяняецца на [дз’] | |
| 3. | Дзеканнем называецца змяненне гука [д] пры яго змякчэнні на гук [т’] | |
| 4. | Цеканнем называецца змяненне гука [т] пры яго змякчэнні на гук [ц’] | |
| 5. | Пасля [дз’] пішуцца літары а, о, э, у | |

**Заданне 3. Устаўце прапушчаныя літары.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

Юпіт…р, камюнік…, р…льеф, др…вотня, стра…с, ч…рствы, л…генда, кал…ндар, ц…рымонія, гл…таць.

**Заданне 4. Папрацуйце перакладчыкамі. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

На римлян оказала большое влияние греческая культура. На основе греческого алфавита римляне создали свой, латинский, алфавит. Им пользуются многие народы мира и в настоящее время. Римляне переводили на свой язык литературные произведения греков. В школах дети изучали греческий язык и литературу.

*(учебное пособие по истории Древнего мира для 5 класса)*

______________________________________________________________________________.

**Заданне 5. Раскрыйце дужкі, пастаўце займеннік *я* ў патрэбную форму.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

***Напрыклад, быць пры (кім?) – быць пры мне.***

Пісалі (каму?) – ____________________________.

Падысці да (каго?) – ____________________________.

Ганарыцца (кім?) – ____________________________.

Успамінаць (аб кім?) – ____________________________,

Абвінавачваць (каго?) – ____________________________.

**Заданне 6. Расстаўце неабходныя знакі прыпынку.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Кніга маленькае акенца ў вялікі свет.
2. Работа і корміць і поіць.
3. Ходзіць дзед белабароды полем лесам пералескам.
4. Сябры давайце пойдзем на суботнік.
5. У акул зубы растуць безупынна і яны заўсёды вострыя.

**Заданне 7. Ад слова *бегчы* пры дапамозе прыставак утварыце 5 новых слоў. Патлумачце, як прыстаўка паўплывала на значэнне ўтвораных слоў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за ўтворанае слова; 0,5 бала – за тлумачэнне).*

| *Слова* | *Значэнне* |
|---|---|
| *Напрыклад, прыбегчы* | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 8. Аднавіце "рассыпаныя" фразеалагізмы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў (напрыклад, А3, Б2, В1, Г5, Д4).**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| А. белая | 1. рог |
| Б.барані | 2. каша |
| В. фількава | 3. варона |
| Г. бярозавая | 4. рэкі |
| Д. малочныя | 5. грамата |

**Адказ: А…, Б…, В…, Г…, Д… .**

**Заданне 9. Растлумачце лексічнае значэнне слоў з легенды М.Танка "Ля вогнішч начлежных"праз падбор сінонімаў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| **Слова** | **Сінонім** |
|---|---|
| *Прыклад, цівун* | *наглядчык* |
| золак | |
| вогнішча | |
| магнат | |
| прывід | |
| краля | |

**Заданне 10. Літаратурны калейдаскоп.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| **Пытанне** | **Адказ** |
|---|---|
| Нарадзіўся ў горадзе Полацку, вучыўся ў Італіі, у славутым Падуанскім універсітэце, вялікі | |

| | |
|---|---|
| вучоны, першадрукар. Пра каго ідзе гаворка? | |
| Да якога віду казак адносіцца казка "Разумная дачка" | |
| Адгадайце загадку: Ляцяць птушкі без крыл, садзяцца – без ног | |
| Якая легенда ляжыць у аснове стварэння паэмы "Ля вогнішч начлежных" М.Танка | |
| Што абазначае назва легенды "Пестунь" | |

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
_____________ І.Г.Лашкевіч
«22» сакавіка 2021 г.

ЗАДАННІ
для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд
па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

Дата правядзення: 1 красакавіка 2021г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 12.00.

**VI клас**

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Паходжанне многіх фразеалагізмаў хаваецца ў далёкай старажытнасці і тлумачыцца светаўспрыманнем нашых продкаў. Што, паводле беларускай народнай мудрасці, трэба пазычыць у сабакі, каб лічыцца бессаромным?____________________
2. Падбярыце сінонім да слова волат – ____________________
3. Метафара – гэта ____________________
____________________
____________________
4. Які беларускі горад называецца так, як і летні месяц? ____________________
5. Адгадайце загадку.

*Інструмент народны духавы, –*
*Добра яго ведаеце вы.*
*Ці з чароту, а ці з дрэва трубка, –*
*Сэрца ўзрушыць самагудка.*

*Адказ:* ____________________

**Заданне 2. Запішыце словы ў фанетычнай транскрыпцыі.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| Слова | Фанетычная транскрыпцыя |
|---|---|
| пясчаны | |
| малацьба | |
| сцерагчы | |
| маянэз | |
| мільён | |

**Заданне 3. Ад назоўнікаў утварыце прыметнікі пры дапамозе суфікса –*ск-*. Адказы запішыце.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

***Напрыклад, швед – шведскі.***

| | |
|---|---|
| Кіргіз – | Нясвіж – |
| Ліпень – | Беларус – |
| Сакавік – | Брат – |
| Слаўгарад – | Таварыш – |
| Турыст – | Ткач – |

**Заданне 4. Папрацуйце перакладчыкамі. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Наблюдая за природными явлениями, человек стремился их понять. В древности людям не хватало знаний, чтобы найти правильное объяснение смены времен года, дня и ночи, происхождения дождя и грома, возникновения и роста растений. Все это объясняли сложенные человеком мифы.

Отголоски древних мифов и религиозных представлений сохранились в белорусских сказках, обрядах, орнаментах народной вышивки.

*(учебное пособие пособие по истории Беларуси для 6 класса)*

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

___

**Заданне 5.** Выпішыце назоўнікі, якія ў беларускай мове маюць мужчынскі род.

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

Мастак, плакса, цень, подпіс, гусь, фае, шынель, нажніцы, кенгуру, медаль, боль, педаль, таполя, жывапіс, задзіра, жырафа, старшыня, далеч, стэп.

**Заданне 6. Вызначце, якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае слова (графічна падкрэсліце).**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Матуля – **падтрымка** ў горы і радасці.
2. Розныя дрэвы растуць у нашых **лясах.**
3. Дамовіліся **арэхі** не есці.
4. Разгарнуў **асцярожна** галіны.
5. **Дзеці,** паважайце сваіх бацькоў.

**Заданне 7. Укажыце спосаб словаўтварэння слоў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

Бяздомны – ________________________________________;
падысці – _________________________________________;
чырвань – ________________________________________;
каменны – ________________________________________;
друкаваць – _______________________________________.

**Заданне 8. Растлумачце значэнні фразеалагізмаў. Адказы запішыце.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны*

| Фразеалагізм | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|
| Заткнуць за пояс | |
| Рукой падаць | |
| Ні свет ні зара | |
| Аршын з шапкай | |
| Бібікі біць | |

**Заданне 9. Устанавіце адпаведнасць паміж назвай твора і аўтарам. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў (напрыклад, А3, Б2, В1, Г5, Д4).**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| А. "Лебядзіны скіт" | 1. Якуб Колас |
| Б. "Вужыная карона" | 2. Змітрок Бядуля |

| | |
|---|---|
| В. "Жывая вада" | 3. Аляксей Пысін |
| Г. "Зямля" | 4. Уладзімір Караткевіч |
| Д. "Проня" | 5. Ян Баршчэўскі |

**Адказ: А…; Б….; В….; Г….; Д…. .**

**Заданне 10. Літаратурны калейдаскоп.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| Пытанне | Адказ |
|---|---|
| Укажыце аўтара твора "Лебядзіны скіт" | |
| Укажыце, якая міфічная істота з'яўляецца поўнаўладным гаспадаром чалавечага жытла? | |
| Укажыце месяц святкавання свята Каляды. | |
| Назавіце твор, галоўным героем якога з'яўляецца Сямён | |
| Хто ўпершыню пераклаў Біблію на родную мову і лічыў гэта найвялікшай справай свайго жыцця | |

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
_________ І.Г.Лашкевіч
«_22_» сакавіка 2021 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

Дата правядзення: 1 красакавіка 2021 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 12.00.

## VII клас

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**
*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Паходжанне многіх фразеалагізмаў хаваецца ў далёкай старажытнасці і тлумачыцца светаўспрыманнем нашых продкаў. Патлумачце, што абазначае фразеалагізм *ахілесава пята*? ______________________________
______________________________________________________________
2. Якому славутаму друкару паставілі помнік у горадзе Полацку?______________________________________________
3. На якое свята згодна легенды зацвітае папараць-кветка? ______________________________________________________________
4. Якія рысы прыметніка ўласцівы дзеепрыметніку? ________________
______________________________________________________________
5. Запішыце лічэбнік ***пяць*** у форме творнага склону адзіночнага ліку.
______________________________________________________________

**Заданне 2. Запішыце фанетычную транскрыпцыю слоў.**
*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| без меры | |
| вучышся | |
| зжалі | |
| з'есці | |
| не мог | |

**Заданне 3. Размяркуйце прыведзеныя ніжэй прыслоўі ў адпаведны слупок табліцы згодна з напісаннем.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

(Абы)як, бес(перастанку), (на)памяць, па(чацвёртае), (у)двух, (па)латыні, (што)вечар, (усё)роўна, (на)смак, гэтак(сама).

| разам | асобна | праз дэфіс |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 4. Папрацуйце перакладчыкамі. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

Эпоха Возрождения стала временем создания многих выдающихся литературных произведений. Они вошли в историю и белорусской, и общеевропейской литературы.

Выдающимся образцом поэзии на латинском языке является «Песнь о зубре» Николая Гусовского. Предполагалось, что она должна поразить западного читателя рассказом о дикой природе Великого Княжества Литовского. Но в результате «Песнь о зубре» стала гимном всей этой стране, ее народу и славной истории.

*(учебное пособие пособие по истории Беларуси для 7 класса)*

**Заданне 5.** Устанавіце адпаведнасць паміж часцінамі мовы ў першым слупку і іх характарыстыкамі ў другім. Адказ запішыце.

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| А. Трайны | 1. Лічэбнік |
| Б. Тройня | 2. Прыметнік |
| В. Трэці | 3. Дзеяслоў |
| Г. Патроіць | 4. Прыслоўе |
| Д. Патроіўшы | 5. Назоўнік |
| | 6.Дзеепрыслоўе |

**Адказ: А…; Б….; В…; Г…; Д… .**

**Заданне 6. Расстаўце неабходныя знакі прыпынку.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільна афармлены пунктуацыйна сказ).*

1. Паветра напоенае пахамі хвоі навісла шызаватай смугой.
2. Заняты сваёй справай я зусім не звяртаў увагі на размову.
3. Шкодна чытаць лежачы.
4. На вільчыку трапечучы крыльцамі шчабятаў і пасвістваў шпак.
5. Падняўшы каўнер і прыгнуўшыся Лабановіч спусціўся з ганка.

**Заданне 7. Устанавіце сэнсавую адпаведнасць паміж падкрэсленымі ў сказах словамі і фразеалагізмамі. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ)*

| | |
|---|---|
| **А.** Алесь **моцна** крыкнуў і ў адказ пачуў такое ж гучнае рэха. | **1.** Колькі душа пажадае. |
| **Б.** Даўно і **шчыра** люблю цябе, Нарач. | **2.** Усёй душой. |
| **В.** Паветра ў гарах чыстае – дыхай **уволю.** | **3.** Да мозгу касцей. |
| **Г.** Дзядзька прыбавіў кроку, бо холад пачаў пранізваць **наскрозь.** | **4.** Ад усяе душы |
| **Д.** **Сардэчна** віншуем вас, мамы, у гэты прыгожы вясенні дзянёк са святам жанчын. | **5.** На ўвесь голас |

**Адказ: А…; Б…; В…; Г…; Д….**

**Заданне 8. Вызначце марфемную будову слоў. Устанавіце адпаведнасць паміж іх марфемнай будовай і прапанаванымі схемамі. Адказ запішыце.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ)*

| Слова | Схема |
|---|---|

| | |
|---|---|
| А. Суседні | 1. Прыстаўка+корань+суфікс+канчатак |
| Б. Праязны | 2. Корань+суфікс+суфікс |
| В. Безумоўна | 3. Корань+суфікс+канчатак |
| Г. Гукнуўшы | 4. Прыстаўка+корань+суфікс+суфікс |
| Д. Пішучы | 5. Корань+суфікс |

**Адказ: А…; Б…; В…; Г…; Д… .**

**Заданне 9. Растлумачце лексічнае значэнне слоў з паэмы Я.Купалы "Курган", падбярыце сінонімы.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| Слова | Сінонім |
|---|---|
| *Прыклад, перуны* | *маланка* |
| абшар | |
| магнат | |
| дукат | |
| хорам | |
| дамоўка | |

**Заданне 10. Запоўніце пустыя калонкі ў табліцы.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожную правільна запоўненую клетку).*

| Твор | Аўтар | Жанр |
|---|---|---|
| "Ручэй" | | |
| | Янка Купала | |
| "Незагойная рана" | | |
| "Маёвая песня" | | |
| | Мікола Лупсякоў | апавяданне |
| "На каляды к сыну" | Змітрок Бядуля | |

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
_____________ І.Г.Лашкевіч
«_22_» сакавіка 2021 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”

Дата правядзення: 1 красакавіка 2021 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 12.00.

**VIII клас**

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Пра які месяц казалі, што ён “…зямлю грэе, а сіверам вее” і калі ён “…халодны – год галодны”? ________________________________
2. Што, паводле беларускай народнай мудрасці, трэба пазычыць у сабакі, каб лічыцца бессаромным? ________________________________
3. Беларусь часта называюць краінай белых буслоў. А як вобразна назваў наш родны край Уладзімір Караткевіч? Гэтыя словы далі назву яго нарысу. ________________________________
4. Укажыце від адносін паміж словамі: грэцкі – грэчаскі________________
5. Назыўныя сказы – гэта ________________________________
________________________________________________
________________________________________________

**Заданне 2. Укажыце, якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| | | | |
|---|---|---|---|
| сшыць | | снег | |
| свята | | вузка | |
| з́ жыта | | носьбіт | |
| без меры | | расчуліць | |
| з’еўшы | | самалёт | |

**Заданне 3. У табліцы пададзены словы на правапіс галосных, у кожным з якіх прапушчаны літары о, э, а. Устаўце прапушчаныя літары ў словы і запішыце іх у слупку справа насупраць адпаведных ім слоў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ж…мчужына | | поч…рк | |
| р…монт | | р…партаж | |
| ж…тон | | адр..с | |
| канц…лярыя | | кр…вавы | |
| с..крэт | | камп’ют..р | |

**Заданне 4. Папрацуйце перакладчыкамі. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

В первой половине XIX века начался процесс формирования нового белорусского литературного языка.

Одним из родоначальников новой белорусской литературы стал выпускник Полоцкой иезуитской академии Ян Барщевский, писавший и по-белорусски, и по-польски. Он автор сборника «Шляхтич Завальня, или Беларусь в фантастических рассказах». Современники сравнивали это произведение со знаменитым собранием арабских сказок «Тысяча и одна ночь».

*(учебное пособие пособие по истории Беларуси для 8 класса)*

______________________________________________________________________

**Заданне 5. Запоўніце табліцу. Пастаўце назоўнікі ў адпаведныя формы.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| Адзіночны лік | Множны лік | Зборная форма |
|---|---|---|
| вучань | | |
| ліст | | |
| бяроза | | |
| звер | | |
| пяро | | |

**Заданне 6. Расстаўце неабходныя знакі прыпынку.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільна афармлены пунктуацыйна сказ).*

1. Па вузкай сцежцы нібы марак ішоў гусак уперавалку.
2. Спяваў усю ноч салавейка выдумшчык самых прываблівых нот.
3. На цябе мой сад гляджу з любоўю.
4. За сялом у нас лугі і нівы і салаўіныя сады ў налівах.
5. Наш край вядома на песні багаты.

**Заданне 7. Выпішыце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

Заснежыць, невыразна, апрацоўка, бязмэтны, награвальнік, выкараніць, бясследны, збор, прыгарад, паціху, апавядальнік, узаконіць.

**Заданне 8. Складзіце са словам *стомлены* 3 словазлучэнні на розныя віды сувязі (дапасаванне, кіраванне, прымыканне) і 2 сказы, каб слова выконвала сінтаксічную сувязь дзейніка і выказніка.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ)*

| | **Прыклад** |
|---|---|
| дапасаванне | |
| кіраванне | |
| прымыканне | |
| у сказе выконвае ролю дзейніка | |
| у сказе выконвае ролю выказніка | |

Заданне 9. **Падкрэсліце чацвёртае лішняе і абгрунтуйце свой выбар.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за выбранае чацвёртае лішняе і 0,5 бала – за абгрунтаванне).*

| **Літаратурны тэрмін** | **Абгрунтаванне** |
|---|---|
| Рытм, рыфма, маналог, страфа | |
| Кульмінацыя, сюжэт, завязка, развязка | |
| Эпітэт, метафара, алегорыя, інверсія | |
| Навела, аповесць, апавяданне, легенда | |
| Ямб, амфібрахій, дактыль, анапест | |

**Заданне 10. Запоўніце табліцу.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| Назва твора | Аўтар | Галоўны герой |
|---|---|---|
| "Дзяльба кабанчыка" | | |
| | Аляксей Дудараў | |
| | | ткачыхі |
| "Паром на бурнай рацэ" | | |
| | Генрых Далідовіч | |